# Раздел 3. ПРОФИЛЬНАЯ И ДОПРОФИЛЬНАЯ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПОДГОТОВКА УЧАЩИХСЯ: МЕТОДИЧЕСКИЕ РАЗРАБОТКИ

## ШЛЯХ ДА АСЭНСАВАНАГА ВЫБАРУ ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАФЕСІІ, АБО ГАНАРОВАЕ ІМЯ «НАСТАЎНІК»

***Н. М. Арціховіч, М. М. Макшыцкая***
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Грэская сярэдняя школа»,*
*Рэспубліка Беларусь*

***Анатацыя.*** Многія навучэнцы педагагічных класаў і іх бацькі, выбіраючы навучанне ў педагагічным класе, зусім не маюць на ўвазе паступленне ў навучальную ўстанову педагагічнага профілю, а кіруюцца ў сваім выбары іншымі матывамі: павышаны ўзровень па прадметах, больш паспяховыя вучні ў класе, прыцягненне да шматлікіх мерапрыемстваў і спраў і г.д. Вопыт паказвае, што часта такія вучні пасля двух гадоў навучання ў педагагічным класе, “паспрабаваўшы” педагагічных проб, прымерыўшы да сябе педагагічныя ролі вырашаюць звязаць свой лёс з педагагічнай прафесіяй. А бывае і так, што навучэнцы, якія ўжо з дзявятага класа агучвалі жаданне быць настаўнікамі і мелі падтрымку сваіх бацькоў, прыходзілі да высновы, што не правільна ўяўлялі педагагічную працу і змянялі свой выбар. Наша грамадства зацікаўлена ў тым, каб любую абраную прафесію маладыя людзі выбіралі асэнсавана. Таму галоўная задача педагогаў – абудзіць імкненне да самапазнання, даць магчымасць паспрабаваць свае сілы, паказаць педагагічную прафесію з розных бакоў. Галоўнае, каб кожны знайшоў сваё прызванне. Прапануемыя заняткі ў Грэскай сярэдняй школе традыцыйна праводзяцца кожны год ў кастрычніку для навучэнцаў 10 педагагічнага класа. На заняткі запрашаюцца вучні 11 педагагічнага класа, іх класны кіраўнік і іншыя настаўнікі школы. У кастрычніку 2018 года такія заняткі былі праведзены ў межах абласнога семінара-практыкума «Педагагічныя класы: вопыт і перспектывы». У распрацоўцы прыводзяцца рэальныя адказы вучняў.

**Тэма: Сацыяльная значымасць працы педагога і патрабаванні да педагагічнай прафесіі з боку грамадства. Спектр педагагічных спецыяльнасцей**

**Задачы:**

- спрыяць фарміраванню ўяўленняў аб сацыяльнай значымасці прафесіі педагога;
- актуалізаваць уяўленні аб патрабаваннях да педагагічнай прафесіі з боку грамадства, абмеркаваць вынікі анкетавання «Што галоўнае павінны атрымаць навучэнцы ад настаўніка?», сфармуляваць праблему, прапанаваць шляхі яе вырашэння;
- абмеркаваць асноўныя і новыя педагагічныя спецыяльнасці і разгледзець прычыны, якія абумовілі іх з’яўленне;
- вызначыцца, патрэбу ў якой з педагагічных спецыяльнасцей мы адчуваем.

**Форма правядзення:** гутарка-дэбаты на зададзеную тэму з элементамі даследавання.

**Абсталяванне**: мультымедыйны праектар.

**Ход занятка:**

**Слова настаўніка:** Добры дзень! Давайце пазнаёмімся, рада прадставіць вам, паважаныя госці, вучняў 10 педагагічнага класа Грэскай сярэдняй школы. Трэба сказаць, што наш клас сфарміраваўся толькі ў гэтым годзе і амаль палова вучняў прыехалі да нас з іншых вёсак Слуцкага раёна і горада Слуцка. Мы цяпер знаходзімся на стадыі фарміравання класнага калектыву, праходзім адаптацыйны перыяд (на мой погляд, паспяхова). Тэма нашых сённяшніх заняткаў:

«Сацыяльная значымасць працы педагога і патрабаванні да педагагічнай прафесіі з боку грамадства. Спектр педагагічных спецыяльнасцей». У мінулы раз мы дамовіліся, што фарматам правядзення заняткаў будзе размова-дэбаты на зададзеную тэму з элементамі даследавання.

Пачнём. Не думаю, што хтосьці сёння будзе спрачацца з тым, што прафесія педагога адна з самых сацыяльна значымых у грамадстве. І патрабаванні грамадства да прадстаўнікоў педагагічнай прафесіі вельмі высокія? Як вы лічыце, чаму?

**Адказы вучняў:**

Таму, што ад настаўніка залежыць, якія будуць вучні. Не ростам ці колерам вачэй, а якія будуць ў іх веды па розных прадметах, аб з'явах у прыродзе і ў жыцці.

Таму, што настаўнік не толькі вучыць,але і выхоўвае, значыць адказвае за тое, якімі людзьмі стануць вучні, якія яны будуць грамадзяне.

Таму, што ад настаўніка залежыць, як вучні будуць ацэньваць свет вакол сябе, сваю ролю,свае здольнасці і магчымасці, настаўнік дапамагае стаць упэўненым, паверыць у свае сілы і дабіцца поспеху.

У руках настаўніка веды прадметныя, веды этычныя, веды аб грамадстве і іншыя веды, якія настаўнікі перадаюць моладзі, а значыць у руках настаўнікаў – будучае, таму, што вучні – сёння, а заўтра – рабочыя, палітыкі, кіраўнікі і г.д.

**Слова настаўніка:** Хто яшчэ хоча выказацца? 11 клас, якая ваша агульная думка?

Адна толькі і надзея, што на настаўнікаў!

А калі сур'ёзна?

Настаўнік – прыклад! Прыклад ва ўсім: у ведах, у адносінах з людзьмі, у паводзінах, нават у стылі адзення. Настаўнікі нашай школы сапраўды з'яўляюцца для нас прыкладам ва ўсім.

**Слова настаўніка:** Дазвольце, я падсумую. Педагог жыве ў грамадстве і разам з грамадствам перажывае ўсе эвалюцыйныя і рэвалюцыйныя перамены, якія ў гэтым грамадстве адбываюцца. У розныя гістарычныя эпохі сацыяльная роля і функцыі настаўніка хоць і змяняліся, але заўсёды захоўвалі свае адметныя агульныя рысы.

Звернемся да нашага дапаможніка (вучні выбіраюць і агучваюць наступны матэрыял):

Па-першае, педагог з'яўляецца рухавіком, каталізатарам грамадскага прагрэса. Выхоўваючы маладое пакаленне, ён у значнай меры спрыяе фарміраванню людзей, якія валодаюць новымі прагрэсіўнымі вытворчымі тэхналогіямі.

Па-другое, педагог выконвае ролю “акумулятара”, які назапашвае ў сабе сацыяльны вопыт. Педагог з'яўляецца захавальнікам і носьбітам шматлікіх грамадскіх каштоўнасцей: агульначалавечых, культурных, інтэлектуальных, духоўных і іншых. І перадае іх маладому пакаленню.

Па-трэцяе, прафесіянальны педагог – цэнтральнае звяно ў неразрыўным ланцугу паміж гістарычным мінулым грамадства і яго перспектыўным будучым.

Па-чацвёртае, настаўнік – спецыяліст, які выбірае з агульнага фонда навукі і культуры той матэрыял, які будзе каштоўны і карысны для выкарыстання ў адукацыйна-выхаваўчай рабоце.

Па-пятае, настаўнік – асоба ўпаўнаважаная грамадствам прадстаўляць свет моладзі перад старэйшым пакаленнем. Ніхто так не ведае асаблівасці, характэрныя рысы, запыты і магчымасці, здольнасці і пажаданні дзяцей і моладзі, як педагог. Таму ён мае маральнае права кампетэнтна выказваць свае меркаванні перад грамадствам аб выхаванні і фарміраваць грамадскую думку па праблемах тэорыі і практыкі выхавання.

Па-шостае, педагог фарміруе духоўны свет моладзі ў адпаведнасці з прынцыпамі і каштоўнасцямі канкрэтнага грамадства, яго нормамі маралі і права, этыкі і эстэтыкі, ну і вядома, у адпаведнасці з тым, як ён сам бачыць усё гэта. Названыя шэсць асноўных сацыяльных роляў і функцый настаўніка прадстаўлены на схеме на экране. І вось яна ў надрукаваным выглядзе, вы можаце ўклеіць яе ў свае сшыткі (Дадатак 1).

**Слова настаўніка**: Запатрабаванасць грамадства або «дзяржаўны заказ» у адукацыі складаецца з запытаў дзяржавы і запытаў карыстальнікаў, г. зн. бацькоў і навучэнцаў, як удзельнікаў адукацыйнага працэсу. Каб зразумець, як карэлююцца паміж сабой гэтыя запыты і якія яны нао-

гул, мы вырашылі правесці анкетаванне бацькоў, настаўнікаў і вучняў. Пытанне, на якое шукаўся адказ, было сфармулявана так: «Што павінны атрымаць ад настаўнікаў навучэнцы за час вучобы ў школе?». Гэтай працай «загарэліся» нашы «гісторыкі» Ганна і Юра. Давайце паслухаем і абмяркуем, што ў іх атрымалася.

**Выступленне вучняў:**

**1 вучань:** на першых занятках мы шмат гаварылі аб тым, што ў адукацыі адбываецца многа новых падзей, укараняюцца новыя ідэі, новыя падыходы, новыя тэхналогіі, пераасэнсоўваюцца вопыт і напрацоўкі мінулай савецкай школы, вывучаецца вопыт замежнай адукацыі, адным словам, наша адукацыя шукае свой асабісты, адметны, перспектыўны шлях. У абмеркаванні таго, якой павінна быць наша беларуская адукацыя, прымаюць удзел і грамадства, і настаўніцтва, і бацькі, і вучні, і, зразумела, адукацыйныя і дзяржаўныя інстытуты.

Мы вырашылі паспрабаваць адказаць на пытанне «Што ж павінны атрымаць ад настаўнікаў вучні за час вучобы ў школе?» Гэта пытанне ўзнікла не выпадкова. Яно ўсплыло падчас абмеркаванняў  вучнямі педагагічнага класа ўмоў залічэння на педагагічныя спецыяльнасці ў ВНУ тых, хто займаецца ў педагагічным класе і вывучае «Уводзіны ў педагагічную прафесію», калі мы разам з бацькамі і класным кіраўніком абмяркоўвалі патэнцыял педагагічнага класа і нашу далейшую вучобу пасля школы.

**2 вучань:** мы правялі анкету сярод бацькоў, настаўнікаў, школьнікаў. Прынялі ўдзел 20 бацькоў вучняў 10–11 класа, 20 вучняў, 20 настаўнікаў. Наша анкета (Дадатак 2) складаецца наступным чынам. На пытанне, што галоўнае павінны атрымаць вучні ад настаўнікаў, прапаноўваецца 10 варыянтаў адказаў. Рэспандэнты павінны расставіць лічбы ад 1 да 10 па меры важнасці адказаў асабіста для іх. Нас найбольш цікавілі першыя тры. Мы разглядзелі тры першыя адказы рэспандэнтаў і параўналі. Вось што ў нас атрымалася:

Настаўнікі лічаць галоўнымі тры наступныя пункты:

1. Набыць высокі ўзровень ведаў па ўсіх прадметах.
2. Захаваць сваё фізічнае і псіхічнае здароўе ў час вучобы, атрымаць трывалыя навыкі здаровага ладу жыцця.
3. Навучыцца прымяняць прадметныя веды ў рэальным жыцці.

Бацькі выбралі такія пункты:

1. Захаваць сваё фізічнае і псіхічнае здароўе ў час вучобы, атрымаць трывалыя навыкі здаровага ладу жыцця.
2. Набыць камунікатыўныя навыкі, уменне працаваць і жыць ў калектыве.
3. Развіць свае здольнасці і вызначыцца з будучай прафесіяй.

Вучні лічаць галоўным:

1. Набыць добрыя веды па тых прадметах, да якіх вучань праяўляе схільнасці (збіраецца здаваць ЦТ).
2. Атрымаць разуменне, спачуванне, спагаду і дапамогу ў цяжкія хвіліны, словы падтрымкі, веру ў поспех.
3. Вызначыцца з будучай прафесіяй.

Мы прыйшлі да высновы, што настаўнік, ідучы на ўрок, лічыць галоўнымі адны мэты, школьнікі ідуць, маючы на ўвазе другія, а бацькі іх адпраўляюць за трэцімі. Такім чынам, удзельнікі адукацыйнага працэсу разыходзяцца ў поглядах на тое, што галоўнае павінен атрымаць вучань у школе.

**Слова настаўніка:** Вывад у вас атрымаўся, прама скажам, не вясёлкавы. Аднак рэзультат ёсць рэзультат! Хачу звярнуць вашу ўвагу на тое, што не адзін з 10 адказаў не застаўся без лічбы. Гэта гаворыць аб тым, што пералічаныя ўсе 10 набыткаў важныя для ўсіх нас: і настаўнікаў, і бацькоў, і вучняў. Толькі прыярытэты мы расстаўляем па-рознаму. Такім чынам, у нас узнікла праблема. Можаце яе сфармуляваць?

Праблема: удзельнікі адукацыйнага працэсу разыходзяцца ў меркаваннях на прыярытэты ў тым, што галоўнае павінен атрымаць вучань у школе. Які спосаб вырашэння вы прапануеце?

**Адказ:** Трэба набліжаць пазіцыі ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу.

– Так! Несумненна! Але як? Якім чынам мы можам гэта зрабіць? Якія вашы прапановы?

**Адказы вучняў**: Мы можам расказаць аб анкетаванні і рэзультатах большай колькасці настаўнікаў, вучняў, бацькоў. Напрыклад, на бацькоўскім сходзе. Калі кожны паспрабуе патлумачыць свае думкі, выслухае іншых, пазіцыі будуць мяняцца.

Мы з мамай адразу адказалі зусім па-рознаму, а потым абмеркавалі, паспрачаліся, пагаварылі і ў выніку паставілі на тры першыя месцы аднолькавыя адказы, толькі ў розным парадку.

Я лічу, трэба ўсім настаўнікам давесці гэтыя рэзультаты да ведама. Тады настаўнікі хутчэй перастрояцца, калі будуць ведаць нашу пазіцыю. А можа яны нам так патлумачаць сваю, што наша пазіцыя зменіцца.

Тады давайце правядзём такі дыспут для настаўнікаў, бацькоў і вучняў 10 і 11 педагагічных класаў ”Што вучань павінен атрымаць ад настаўнікаў за час вучобы ў школе?”

**Слова настаўніка:** Пачула добрыя ідэі. Я рада. Размяркуем абавязкі. Вы рыхтуеце дыспут па ўсіх правілах, а я рыхтую бацькоўскі сход да канца І чвэрці і ўключаю гэта пытанне.

Нам засталося яшчэ абмеркаваць спектр педагагічных спецыяльнасцей. Як заўсёды, мы прасілі падрыхтавацца асобных вучняў і расказаць нам тэарэтычную частку. Калі ласка! Коратка!

**Паведамленне вучня 10 класа «Як падзяляюцца па спецыяльнасцях педагагічныя прафесіі»**

Падставай для дыферэнцыяцыі педагагічных спецыяльнасцей з’яўляюцца розныя прадметныя вобласці ведаў навукі, культуры, мастацтва. Таму бываюць настаўнікі фізікі, матэматыкі, музыкі, эканомікі, жывапісу і іншыя. Другая падстава для дыферэнцыяцыі педагагічных спецыяльнасцей – узроставыя перыяды развіцця асобы (дашкольны ўзрост, малодшы школьны, падлеткавы і г. д.) Наступная падстава для дыферэнцыяцыі – асаблівасці развіцця асобы, звязаныя з псіхафізічнымі і сацыяльнымі фактарамі (парушэнні слыху, зроку, разумовыя парушэнні і іншыя). Так як у сучасным грамадстве неабходным, складнікам развіцця стала патрэба ў неперарыўнай адукацыі, то педагагічная дзейнасць распаўсюдзілася на іншыя сферы жыцця грамадства, вылучыліся такія напрамкі педагагічнай дзейнасці, як паслядыпломная адукацыя, дадатковая прафесійная адукацыя, прафесійная адукацыя і перaадукацыя беспрацоўных і іншыя.

**Слова настаўніка:** Дзякуй. Думаю, што ўсё зразумела і ўжо нам вядома. У пачатку 2014 года Маскоўскай школай кіравання «Сколкава» і Агенцтвам стратэгічных ініцыятыў быў прадстаўлены «Атлас новых прафесій». Па меркаванні аўтараў дадзенай распрацоўкі да 2020 года ў сферы адукацыі чакаецца з’яўленне новых педагагічных прафесій і спецыяльнасцей. Аднак, прайшло толькі 4 гады, а многія з іх ужо сёння паўсюдна трывала занялі свае месцы ў адукацыйным працэсе нашай краіны і свету. Зараз вучні, у каго было такое заданне, раскажуць нам, што гэта за прафесіі. А ўсіх астатніх я папрашу падумаць над пытаннем, якая з новых педагагічных прафесій вас больш зацікавіла? Педагога якой з гэтых спецыяльнасцей вам бы хацелася бачыць каля сябе ўжо сёння ў нашай школе?

**Выступленні вучняў:**

1. Мадэратар. 3. Трэнер па майндфітнесу

2. Цьютар 4. Гульнепедагог

**Слова настаўніка:** Ну, вось. Коратка і змястоўна мы даведаліся пра тыя з новых педагагічных спецыяльнасцей, якія сёння паспяхова ўкараніліся ў адукацыю. Якога ж сучаснага педагога, на ваш погляд, вам карысна было б мець ўжо сёння?

**Адказы вучняў:**

Нядрэнна, каб хто дапамагаў гуляць на кампе, калі складаны ўзровень.

А сур’ёзна?

Напэўна, цьютар!

Чаму?

Бо гэта ж такі асабісты твой педагог, які дапамагае менавіта табе, падбірае табе заданні, каб табе было лепш вучыцца, вучыць іменна цябе.

**Слова настаўніка**: Я зразумела. У мяне для вас сюрпрыз. Успомніце, калі ласка, колькі сумесных мерапрыемстваў прайшло ў вучняў 10 і 11 педагагічных класаў за мінулы месяц.

- Многа! У інтэрнэт-гульню гулялі. На спаборніцтвы па футболу ездзілі. Дзень самакіравання правялі. Ва ўсіх школьных алімпіядах паўдзельнічалі. Свята да Дня настаўніка правялі. Нават у газету «Мінская праўда» разам папалі.
- І сюрпрыз мой такі: сёння ў кожнага з вас з'явіцца асабісты цьютар у рамках вывучэння «Уводзін у педагагічную прафесію» з ліку вучняў 11-га педагагічнага класа.
- Калі ласка, цьютары, разбярыце падапечных!
- Цяпер у кожнага з вас з'явіліся новыя выгоды: 10-класнікі будуць мець дапамогу ад сваіх цьютараў у стварэнні педагагічнага партфоліа, у падрыхтоўцы да педагагічных проб і проста старэйшых таварышаў! А 11-класнікі маюць шчаслівую магчымасць паспрабаваць сябе ў новай педагагічнай ролі.

Для вас гэта яшчэ адна педагагічная проба, і яна можа заняць месца ў вашым педагагічным партфоліа.

Адразу і заданне для 11-класнікаў. Распрацуйце са сваімі падапечнымі «Кодэкс цьютара».

Будзем спадзявацца, што сёння нарадзілася новая традыцыя нашай школы і цяпер кожны год вучні новага 10 педагагічнага класа будуць мець свайго асабістага цьютара.

Ну, і самае прыемнае. Слова 11 класу. Залічэнне ў педкласаўцы. Уручэнне значкоў вучня педагагічнага класа.

**Заключнае слова настаўніка**: Свет прафесій шырокі. Кожны можа знайсці прафесію, якая будзе задавальняць свайго ўладальніка і маральна і матэрыяльна, прыносіць радасць творчасці і супрацоўніцтва. Сёння мы яшчэ раз падкрэслілі значнасць і значымасць педагагічнай прафесіі, важнасць таго, каб у ёй не было выпадковых людзей, бо «настаўнік – не толькі прафесія, настаўнік – гэта прызванне».

Ці задаволены вы сённяшнімі заняткамі, сабой і мной?

Я задаволена. Дзякую ўсім за працу! Дзякую за ўвагу! Да пабачэння!

## *Спіс літаратуры*


1. Введение в педагогическую профессию / под общей ред. В.А. Капрановой. – Минск: Новое знание, 2015.
2. Невдах, С. И. Педагогика в вопросах и ответах / С. И. Невдах, В. Н. Пунчик, И. А. Царик. – Минск, БГПУ, 2017.
3. Атлас педагогических профессий и ролей: пособие / А. В. Позняк [и др.]. – Минск, БГПУ, 2018.
4. Профессиональная ориентация учащихся / сост. О. А. Хоткевич. – Минск: Красико-Принт, 2004.